**УДК 355.425.4(476)** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-70-75**

# СМАЛЕНСКІЯ ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ (1942–1944 гг.): АРГАНІЗАЦЫЙНЫ І БАЯВЫ АСПЕКТ

***канд. гіст. навук, дац. А.А. КРЫВАРОТ***
***(Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)***

*У артыкуле асвятляецца арганізацыйная і баявая дзейнасць на тэрыторыі Віцебшчыны смаленскіх партызан, накіраваных у рэгіён для разгортвання ўзброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў у 1942–1944 гг., прыведзены прыклады сумесных дзеянняў віцебскіх і смаленскіх партызан па стварэнні атрадаў і брыгад і ўдзел у гэтым Віцебскага абкама КП(б)Б і камандавання 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту. Паказана, што ў 1942 г. асноўным месцам узаемадзеяння партызан былі тылавыя аб'екты праціўніка на беларускай тэрыторыі ў трыкутніку дарог Віцебск – Орша – Смаленск. Адзначана, што новы этап у баявой дзейнасці смаленскіх партызан на Віцебшчыне звязаны з перадыслакацыяй на розныя перыяды са Смаленскай вобласці некалькіх брыгад (палкоў). Згаданы найбольш значныя баявыя аперацыі, праведзеныя сумесна віцебскімі і смаленскімі партызанамі ў розных рэгіёнах Віцебскай вобласці. У высновах канстатуецца, што смаленскія партызанскія фарміраванні ўнеслі прыкметны ўклад у разгортванне партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай Вайны.*

***Ключавыя словы:*** *атрад, блакада, брыгада, воінскі эшалон, гарнізон, група, дыверсія, камунікацыі, карная аперацыя.*

Кантакты партызан Віцебшчыны і Смаленскай вобласці распачаліся восенню 1941 г., калі некаторыя групы і атрады пад націскам карнікаў былі вымушаны перамясціцца з Багушэўскага, Мехаўскага, Суражскага і іншых раёнаў на сумежную тэрыторыю РСФСР. На Смаленшчыне беларускія групы і атрады сумесна з мясцовымі баявымі адзінкамі стваралі новыя партызанскія падраздзяленні, а таксама сумесна праводзілі напады на тылавыя аб'екты акупантаў [11, л. 8; 12, л. 17; 17, л. 19; 20, л. 19, 33, 35, 52; 33, с. 26].

Пасля пераможнай для Чырвонай Арміі бітвы пад Масквой часці 4-й ударнай арміі (далей 4-й УА) Калінінскага фронту ў выніку правядзення Тарапецка-Холмскай аперацыі выйшлі на рубеж Веліж – Дзямідаў і ўшчыльную падышлі да граніцы Беларусі каля Суражскага і Мехаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. Глыбокі прарыў часцей Краснай Арміі ў гэтым рэгіёне і дапамога з боку смаленскіх і віцебскіх партызан аказалі вырашальны ўплыў на становішча ў рэгіёне. Флангі паміж групамі нямецкіх армій «Цэнтр» і «Поўнач» былі не ўмацаваны, а таксама адсутнічала аператыўнае ўзаемадзеянне. У абароне праціўніка ад Усвят Калінінскай вобласці да Веліжу Смаленскай вобласці ўтварыўся 40-кіламетровы пралом па фронце, які ад пачатку лютага 1942 г. стаў кантралявацца часцямі 4-й УА, беларускімі і смаленскімі партызанамі [1, с. 134, 627–628].

Такую спрыяльную сітуацыю стала выкарыстоўваць армейскае камандаванне сумесна з Паўночна-Заходняй аператыўнай групай ЦК КП(б)Б і Віцебскім абкамам КП(б)Б для пашырэння партызанскага руху ў тыле праціўніка і разгортвання дыверсій на яго камунікацыях. У тыл немцаў, найперш ва ўсходнія рэгіёны Віцебшчыны, сталі накіроўвацца ўпаўнаважаныя, арганізатарскія і дыверсійна-разведвальныя групы і атрады. Устанаўленню шчыльнай каардынацыі паміж армейскім камандаваннем і партыйнымі структурамі ў справе разгортвання партызанскага руху ў рэгіёне садзейнічала прызначэнне 9 сакавіка 1942 г. першага сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б І.А. Стулава членам Ваеннага савета 4-й УА [1, с. 490, 580; 2, с. 206].

Для пашырэння ўзброенай барацьбы на ўсходзе Віцебшчыны Ваенным саветам 4-й УА былі шырока прыцягнуты партызаны Смаленшчыны. Па няпоўных падліках вясной – пачатку лета 1942 г. больш за 10 смаленскіх партызанскіх адзінак агульнай колькасцю каля 200 чалавек перабраліся ў вызначаныя армейскім камандаваннем усходнія раёны Віцебскай вобласці, дзе разам з мясцовымі патрыятычнымі групамі стварылі новыя партызанскія атрады. Так, 20 сакавіка 1942 г. паводле распараджэння Ваеннага савета 4-й УА на тэрыторыю Лёзненскага раёна прыбыў смаленскі атрад «Радзіма» (камандзір А.Ф. Данукалаў). У канцы сакавіка 1942 г. смаленскі атрад папоўніўся мясцовымі групамі на чале з У.Ю. Дзячэнкам і М.Р. Малахоўскім з вёсак Войтава і Каралёва, а затым групы афарміліся ў самастойныя атрады «Валодзя» і «Прагрэс». У атрад «Радзіма» таксама ўлілася маладзёжная група Т. Дубоўкі. У сярэдзіне красавіка 1942 г. на тэрыторыі Суражскага раёна да адной з ініцыятыўных груп атрада «Радзіма» далучыліся 30 жыхароў з вёсак Стукальна і Уласава. У выніку аб'яднання быў створаны атрад, які ў кастрычніку 1942 г. атрымаў назву «Крэпасць» [7, с. 86–87; 19, л. 16; 21, л. 18, 28; 32, с. 231, 223, 329].

Найбольш актыўна вясной – летам 1942 г. на ўсходзе Віцебскай вобласці пашырэннем партызанскага руху займалася 2-я Смаленская брыгада (камандзір В.В. Стралкоў), якая накіравала ў памежныя беларускія раёны некалькі арганізатарскіх груп. На тэрыторыю Лёзненскага раёна для сувязі з мясцовымі партызанскімі адзінкамі і стварэння новых атрадаў была перакінута група колькасцю 15 чалавек на чале з пракурорам Панізаўскага раёна І.Р. Чарнышовым. Яшчэ 5 груп агульнай колькасцю звыш 50 чалавек прабраліся ў Багушэўскія лясы і раён Оршы. Арганізацыйныя магчымасці 2-й Смаленскай брыгады стараўся выкарыстоўваць Ваенны савет 4-й УА для прыняцця дадатковых мер па разгортванні партызанскіх сіл у раёнах Віцебскай вобласці, праз якія праходзілі стратэгічныя камунікацыі нямецкай групы армій «Цэнтр». У другой палове чэрвеня 1942 г. для выкання задач армейскага камандавання з брыгады В.В. Стралкова ў Дубровенскі раён на поўдзень ад чыгункі Смаленск – Орша было

накіравана 25 партызан, а ў Лёзненскі раён былі перакінуты групы Е.М. Пруднікава і П.Ц. Вішнёва. Апошняя да канца лета 1942 г. аб'яднала групы акружэнцаў і мясцовых партызан у раёне вёсак Таранкі і Мопра і афармілася ў атрад [13, л. 129; 14, л. 130; 26, л. 6; 30, л. 121–123, 125].

Віцебская вобласць была першай на акупаванай тэрыторыі Беларусі, дзе сталі разгортвацца партызанскія брыгады. У гэтым працэсе прымалі ўдзел як беларускія, так і смаленскія партызаны. Фарміраванне першых такіх злучэнняў знаходзілася пад пільным кантролем партыйных органаў і армейскага камандавання. У арганізацыі 1-й Беларускай брыгады (камандзір М.П. Шмыроў) непасрэдна ўдзельнічалі сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б І.А. Стулаў, прадстаўнікі Паўночна-Заходняй групы ЦК КП(б)Б В.Р. Раманаў і 4-й УА А.Я. Паўлючэнкаў. У склад новай партызанскай адзінкі разам з беларускімі атрадамі ўвайшло смаленскае падраздзяленне, камандзір якога Я.З. Захараў стаў яе начальнікам штаба. Стварэнне брыгады мела важнае значэнне для далейшага развіцця партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці. На баявую адзінку адразу была ўскладзена задача па ўтрыманні «Віцебскіх варот» [2, с. 337; 22, л. 10; 24, л. 1–3, 4–6, 27, 654; 32, с. 226–227].

Пры фарміраванні брыгады «Аляксея» (камандзір А.Ф. Данукалаў), распачатым у адпаведнасці з рашэннем Ваеннага савета 4-й УА ад 25 красавіка 1942 г., яе аснову складалі смаленскія атрады. На тэрыторыі Лёзненскага раёна спачатку аб'ядналіся атрады «Радзіма» і «Граза ворагам», якія прыбылі са Смаленшчыны, а таксама атрад «Крэпасць», створаны сумесна смаленскмі партызанамі і беларускімі патрыятычнымі групамі. У канцы мая 1942 г. палову асабовага складу брыгады, якая налічвала 402 чалавекі, складалі ўжо беларусы. Цікавым з'яўляецца факт, што па першым часе брыгада падпарадкоўвалася камандаванню Смаленскага партызанскага злучэння «Баця». Толькі 7 чэрвеня 1942 г. рашэннем Ваеннага савета 4-й УА брыгада была вызначана як самастойная баявая адзінка для дзеянняў у раёне Віцебск – Рудня – Веліж. Асаблівасць фарміравання 2-й Смаленскай брыгады заключалася ў тым, што яна пачала арганізоўвацца з вылучанай 1-й Беларускай брыгадай ініцыятыўнай групы ў складзе беларускіх і калінінскіх партызан пад камандаваннем В.В. Стралкова і далучэннем да яе новых партызанскіх адзінак, а таксама жыхароў Рудненскага, Селіжарскага, Панізаўскага раёнаў Смаленскай вобласці. Штаб брыгады (камандзір В.В. Стралкоў) па першым часе знаходзіўся ў вёсцы Аброк у паласе фронту 4-й УА. У фарміраванні брыгады разам з афіцэрамі 8-га аддзялення палітаддзела 4-й УА прымаў удзел прадстаўнік Віцебскага абкама КП(б)Б Г.Д. Рэзнікаў. Скамплектаваныя ў франтавой паласе атрады 2-й Смаленскай брыгады 24 красавіка і 14 мая 1942 г. былі перапраўлены ў тыл праціўніка з задачай уздымаць мясцовае насельніцтва на барацьбу супраць акупантаў, забяспечваць свой колькасны рост і штодзённа наносіць удары па тылавых аб'ектах ворага [2, с. 337; 3, с. 345; 7, с. 86; 19, л. 16; 25, л. 2, 14–15, 19, 159, 368; 33, с. 28].

Сумесная арганізацыйная дзейнасць беларускіх і смаленскіх партызан вясной – летам 1942 г. на тэрыторыі Віцебшчыны садзейнічала гуртаванню савецкіх патрыётаў для барацьбы з германскімі акупантамі. Атрады і брыгады, стовораныя сумеснымі намаганнямі партызан Віцебшчыны і Смаленшчыны, базіраваліся ў паласе адказнасці 4-й УА Чырвонай Арміі і дзейнічалі ў яе інтарэсах, наносячы ворагу сур'ёзны ўрон у жывой сіле і тэхніцы. Важнейшай баявой задачай народных мсціўцаў з'яўлялася нанясенне ўдараў па камунікацыях праціўніка ў трохкутніку дарог Віцебск – Орша – Смаленск, каб арганізаваць крушэнне цягнікоў, мініраваць дарогі, знішчаць базы паліва, зброі, боепрыпасаў і харчоў, рабіць засады. З гэтай мэтай Ваенны савет 4-й УА арганізаваў навучанне падрыўной справе і ўзяў на поўнае забеспячэнне ўсімі відамі ўзбраення і падрыўной тэхнікі не менш за 300 беларускіх і смаленскіх партызан [2, с. 400; 3, с. 345; 15, л. 31, 33, 35, 38; 30, л. 121–123, 125].

Для ўзмацнення баявой дзейнасці на камунікацыях праціўніка на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў рэгіён праз «Суражскія вароты» 12 жніўня 1942 г. прабыў дыверсійны атрад «Перамога» (камандзіры Рыбакоў, К.І. Новікаў), сфарміраваны Гжацкім райкамам ВКП(б) Смаленскай вобласці. Ва ўзаемадзеянні з партызанамі брыгады «Аляксея» смаленскі атрад нанёс шэраг выніковых удараў па камунікацыях праціўніка. Так, 13 верасня 1942 г. партызаны на ўчастку чыгункі Крынкі – Лёзна падарвалі цягнік з карнікамі, а ў канцы лістапада – пачатку снежня 1942 г. разам з беларускімі партызанамі на ўчастку Крынкі – Заольша пусцілі пад адхон тры воінскія эшалоны. Усяго за жнівень – снежнь 1942 г. байцы смаленскага атрада «Перамога» асобна і ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі брыгады «Аляксея» падарвалі 20 эшалонаў, пяць мастоў, знішчылі больш за 40 аўтамашын. [23, л. 81–91; 33, с. 28].

У другой палове жніўня 1942 г., каб збіць хвалю партызанскіх дыверсій на камунікацыях у трохкутніку дарог Віцебск – Смаленск – Орша, нямецкае камандаванне разгарнула буйную карную аперацыю «Грыф» (16–30.08. 1942). У зоне наступлення акупантаў апынуліся беларускія фарміраванні К.С. Заслонава, А.Ф. Данукалава, К.В. Зюкава, Н.І. Талеркі, К.А. Сінякова, смаленскія падраздзяленні М.В. Антоненкава, М.М. Кузняцова, А.Г. Саўчанкі, А.Ф. Шастапалава, І.Е. Чарнышова, атрад 4-й УА на чале з Н.В. Сакаловым і атрада НКУС СССР на чале с Ф.Ф. Азміцелем. Карная акцыя разгортвалася на тэрыторыі, якую кантралявала брыгада К.С. Заслонава, таму камандзір стаў каардынаваць дзеянні брыгад і атрадаў. План барацьбы з карнікамі быў распрацаваны на нарадзе каманднага складу партызанскіх фарміраванняў. Партызаны адбівалі атакі ворага на ўсіх участках абароны. Так, каля вёскі Бабінавічы брыгады А.Ф. Данукалава і К.В. Зюкава ўзаемадзейнічалі са смаленскімі атрадамі М.М. Кузняцова і А.Г. Саўчанкі. Каб пазбегнуць зацяжных баёў з вялікімі сіламі карнікаў, К.С. Заслонаў адвёў партызанскія сілы ў Бабінавіцкія лясы Лёзненскага раёна, дзе атрады занялі кругавую абарону, а 22 жніўня 1942 г. у адпаведнасці з яго ўказаннямі прарвалі блакаду трыма групамі ў розных напрамках [1, с. 180; 2, с. 449; 7, с. 64–68; 19, л. 45].

Разам з дыверсійнай дзейнасцю на камунікацыях у трохкутніку дарог Віцебск – Смаленск – Орша партызаны наносілі ўдары па апорных пунктах праціўніка. Так, смаленскі атрад «Перамога» сумесна з беларускімі падраздзяленнямі правёў у трохкутніку некалькі паспяховых аперацый супраць гарнізонаў. У выніку налёту на немцаў смаленскіх партызан і беларускага атрада імя В.І. Чапаева (камандзір М.П. Ахметчык) 16 жніўня 1942 г. у вёсцы Фокіна

Лёзненскага раёна было забіта 20 і паранена 30 карнікаў. Гэтыя ж атрады падчас удару 20 жніўня 1942 г. па гарнізону Уна на шашы Віцебск – Смаленск знішчылі 40 паліцэйскіх, 26 жніўня 1942 г. разграмілі ўправу ў вёсцы Пагосцішча і ўзялі ў палон 15 паліцэйскіх, а 31 жніўня 1942 г. разбілі нямецка-паліцэйскі гарнізон і ліквідавалі валасную ўправу ў вёсцы Красыні, ліквідаваўшы пры гэтым 30 акупантаў [23, л. 49, 51, 61, 81–83].

У некаторых выпадках смаленскія партызанскія падраздзяленні ў 1942 г. накіроўваліся для разгортвання барацьбы супраць акупантаў на захадзе Віцебшчыны. Атрад «Кастрычнік» (камандзір Ф.К. Юрчанка), створаны ва Усвяцкім раёне Смаленскай вобласці з мясцовага партыйнага і камсамольскага актыву, у сярэдзіне кастрычніка 1942 г. перайшоў лінію фронту і меў заданне прабрацца ў Міёрскі раён. Аднак падчас пераходу ва ўказаны рэгіён атрад пры пераправе Заходняй Дзвіны прыняў бой і быў вымушаны падзяліцца на тры групы. У лістападзе 1942 г. групы злучыліся і праводзілі баявыя дзеянні ў Расонскім раёне. У сакавіку 1943 г. атраду ўдалося прабрацца на захад Віцебшчыны. Адна частка падраздзялення на чале з яго камандзірам дыслацыравалася ў вёсцы Глоты Пліскага раёна, а другая пад камандаваннем камісара І.І. Юкшы перайшла ў Міёрскі раён і базіравалася каля хутара Зялёнка. Да канца жніўня 1943 г. падраздзяленне налічвала ў сваіх шэрагах 300 чалавек і разгарнулася ў брыгаду «Кастрычнік» (камандзір Ф.К. Юрчанка) у складзе 4-х атрадаў і ўзвода разведкі [29, л. 50, 52, 57–57а].

Новы этап арганізацыйнай і баявой дзейнасці смаленскіх партызан на Віцебшчыне звязаны з пачаткам перадыслакацыі на яе тэрыторыю з канца1942 г. на розны час Смаленскай вобласці брыгад і палкоў. У сваёй дакладной ад 1 чэрвеня 1943 г. П.К. Панамарэнку першы сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б І.А. Стулаў адзначаў, што з восені 1942 г. чатыры смаленскія брыгады пад камандаваннем І.Р. Шлапакова, І.М. Бадзіна, П.Т. Вішнёва, А.Е. Сакалова колькасцю 250–300 чалавек кожная выйшлі са сваіх раёнаў на Смаленшчыне і знаходзіліся ў Віцебскай вобласці. У дакуменце ўказана, што гэтыя смаленскія фарміраванні не выконваюць загады армейскага камандавання аб вяртанні ў свае раёны. Таму аўтар дакладной прапанаваў кожную з гэтых брыгад падзяліць на два самастойна дзеючыя атрады і выдзеліць 15 дыверсійных груп колькасцю і абавязаць іх весці дыверсійную работу на важнейшых камунікацыях Смаленск – Орша, Смаленск – Віцебск [16, л. 232].

Заклапочанасць тым, што ў Суражскай партызанскай зоне была сканцэнтравана вялікая колькасць брыгад, атрадаў і груп, дыктавалася тым, што рэгіён станавіўся аб’ектам карных аперацый акупантаў. Так здарылася, што ў пачатку лютага 1942 г. у трохкутніку Гарадок – Сураж – Мяжа дыслакавалася 8 беларускіх брыгад, 15-я Смаленская (камандзір І.М. Бадзін), атрад калінінскіх партызан, армейскія і чэкісцкія падраздзяленні (агульная колькасць партызан складала 9–10 тысяч чалавек). Большасць фарміраванняў перабралася сюды яшчэ раней з-за праследу немцаў і, нягледзячы на ўказанні ЦШПР і Віцебскага абкама КП(б)Б, так і не перайшла ў іншыя рэгіёны. Выкарыстаўшы такую сітуацыю, гітлераўскае камандаванне 12 лютага 1943 г. сіламі да 35 тысяч салдат і афіцэраў разгарнула карную аперацыю пад кодавай назвай «Шаравая маланка». Праз два тыдні ў выніку цяжкіх баёў брыгады былі часткова рассеяны, захоўваючы атрадныя баявыя адзінкі часткова выйшлі з акружэння. Да пачатку сакавіка 1943 г. частка партызанскіх сіл ва ўмовах блакады адбівала атакі карнікаў у раёне Шчалбоўскіх лясоў. У адным з такіх баёў пад кіраўніцтвам камандзіра 15-й Смаленскай брыгады І.М. Бадзіна выйшлі з акружэння да 1500 партызан. За час карнай акцыі партызаны вывелі са строю да 500 акупантаў. У сваю чаргу, з-за розных пралікаў, у тым ліку і ў кіраванні баявымі дзеяннямі партызанскімі сіламі, брыгады і атрады страцілі 384 чалавекі забітымі, 135 параненымі і 1075 прапаўшымі без вестак [1, с. 633–634; 16, л. 206, 214–215; 24, л. 148–155, 171–173, 179–180].

Перадыслакацыя смаленскіх партызанскіх брыгад і Смаленскага палка І.Ф. Садчыкава садзейнічала актывізацыі дыверсійнай дзейнасці народных мсціўцаў на камунікацыях ворага на тэрыторыі Віцебшчыны. Большасць аперацый смаленскія брыгады і атрады рыхтавалі і праводзілі разам з беларускімі партызанамі. Пачынаючы з лютага 1943 г. па заданні аператыўнай групы 4-й УА падраздзяленні 17-й Смаленскай брыгады (камандзір Р.І. Капусцін) разам з брыгадай «Аляксея» праводзілі засады на дарогах у Лёзненскім раёне. Паводле плана, распрацаванага камандаваннем Сенненскай партызанскай зоны, беларускія брыгады імя К.С. Заслонава, «Аляксея», П.І. Кірылава, В.С. Лявонава разам з 16-й Смаленскай брыгадай (камандзір І.Р. Шлапакоў) і палком І.Ф. Садчыкава 28 ліпеня 1943 г. разбурылі чыгуначнае палатно ад станцыі Вятны да Чашнікаў і Лепеля. Падчас аперацый «Рэйкавая вайна» (3 жніўня – сярэдзіна верасня 1943 г.) і «Канцэрт» (19 верасня – пачатак лістапада 1943 г.) былі ажыццёўлены сумесныя ўдары па воінскіх эшалонах праціўніка на чыгуначных лініях і станцыях, скаардынаваныя падрывы чыгуначнага палатна, узаемадапамога мінамі, толам, дэтанатарамі. Падраздзяленні палка І.Ф. Садчыкава на чыгуначных лініях Орша – Віцебск і Орша – Лепель за першую дэкаду жніўня 1943 г. падарвалі 4255 рэек. На працягу жніўня 1943 г. у Сенненскім раёне 16-я Смаленская брыгада пусціла пад адхон чатыры эшалоны і падарвала 14 рэек. Падрыўнікі 1-й Смаленскай брыгады (камандзір Н.П. Пятровічаў) восенню 1943 г. сумесна з беларускімі партызанамі правялі шэраг паспяховых дыверсій у раёне станцый Крупкі і Багушэўск [3, с. 346–347; 4, с. 176-178; 6, с. 301–302; 31, с. 62–63, 460–461].

У канцы 1943 г. 16-я Смаленская брыгада і полк І.Ф. Садчыкава разам з пятнаццаццю беларускімі брыгадамі па загадзе ЦШПР перайшлі ў Полацка-Лепельскую партызанскую зону. Тут беларускія і смаленскія партызаны не толькі адбівалі атакі карнікаў, але і праводзілі дыверсіі на тылавых камунікацыях 3-й нямецкай танкавай арміі. Ноччу 1 лютага 1944 г. полк І.Ф. Садчыкава сумесна з брыгадамі Д.В. Цябута, В.В. Мельнікава падарвалі на чыгунцы Полацк – Крулеўшчына 2500 рэек і 7 чыгуначных мастоў. Такі маштабны ўдар прывёў да таго, што ў заторы апынулася вялікая колькасць нямецкіх эшалонаў. Па сігналах партызан авіяцыя 1-га Прыбалтыйскага фронту нанесла ўдары па транспарце праціўніка. У ноч на 8 сакавіка 1944 г. група партызан 16-й Смаленскай брыгады ў складзе В. Бугаёвай, В. Кулько, Е. Шупіла, З. Варламавай, Н. Самацветавай пры дапамозе беларускіх партызан падарвала нямецкі эшалон з танкамі, боепрыпасамі, а таксама прычапны вагон з афіцэрамі. 23 сакавіка

1944 г. беларускія і смаленскія партызаны нанеслі адначасовы ўдар па чыгунцы Полацк – Маладзечна і вузкакалейцы Параф'янава – Беразіно. Толькі за сакавік 1944 г. партызаны зоны падарвалі 7309 рэек, дзевяць чыгуначных мастоў, пусцілі пад адхон 26 эшалонаў. Сваімі актыўнымі дзеяннямі брыгады Полацка-Лепельскай зоны пазбавілі 3-ю нямецкую танкавую армію магчымасці карыстацца дарогай Лепель – Беразіно – Параф'янава са снежня 1943 г. і да пачатку лета 1944 г. [9, с. 297–298; 10, с. 59, 84; 33, с. 31–32].

Смаленскія партызанскія фарміраванні праводзілі дыверсіі на камунікацыях да поўнага вызвалення Віцебшчыны ад германскіх войск. Напярэдадні і ў час Беларускай наступальнай аперацыі смаленскія і беларускія партызаны наносілі скардынаваныя ўдары, каб паралізаваць перавозкі праціўніка па дарогах Полацк – Даўгаўпілс, Полацк – Маладзечна, Орша – Барысаў. Так, 20 чэрвеня 1944 г. Смаленскі полк «13» сумесна з беларускімі партызанамі ліквідаваў ахову і падарваў каля двух кіламетраў палатна на лініі Крупкі – Орша. На працягу 26 чэрвеня 1944 г. батальёны палка І.Ф. Садчыкава на ўчастку Будслаў – Крывічы падарвалі 1170 рэек, забілі і паранілі 10 нямецкіх салдат і афіцэраў. У маі – чэрвені 1944 г. 1-я Смаленская брыгада правяла рэйд па тэрыторыі Бягомльскага, Ушацкага, Лепельскага раёнаў і сумесна з віцебскімі партызанамі нанесла акупантам заўважны ўрон у жывой сіле і тэхніцы. За 25–28 чэрвеня 1944 г. атрады і беларускія падраздзяленні ў раёне Лепеля разам нападалі на калоны праціўніка, якія адступалі па захад [3, с. 347; 5, с. 462, 493–494, 661].

Важнае месца ў баявой дзейнасці смаленскіх брыгад і палкоў на тэрыторыі Віцебшчыны, пачынаючы з вясны 1943 г., займалі ўдары па нямецка-паліцэйскіх гарнізонах. Ужо 11 красавіка 1943 г. 16-я Смаленская брыгада, Смаленскі полк І.Ф. Садчыкава, прыбыўшыя 8 сакавіка 1943 г. па заданні Цэнтра на тэрыторыю Беларусі, сумесна з брыгадай імя К.С. Заслонава напалі на апорныя пункты праціўніка ў Трубаносах, Латыгале і Нямойце. Акрамя таго, 16-я Смаленская брыгада разграміла буйное падраздзяленне гітлераўцаў у вёсцы Рай, гарнізон у вёсцы Чудня, групу артылерыстаў у населеным пункце Сялец. У жніўні 1943 г. партызанскі полк І.Ф. Садчыкава і атрады брыгады В.С. Лявонава разам напалі на гарнізоны ў населеных пунктах Гарывец Сенненскага раёна, дзе ўзялі ў палон трох немцаў і чатырох паліцэйскіх, забілі 28 гітлераўцаў, і Чарэя Халопеніцкага раёна [3, с. 345; 4, с. 176–178; 18, л. 177, 187].

Для падтрымкі наступальных дзеянняў войск Чырвонай Арміі на віцебскім напрамку восенню 1943 г. і дэзарганізацыі абароны ворага беларускія і смаленскія партызаны па ўказанні ЦШПР і БШПР наносілі ўзгодненыя ўдары вялікімі сіламі па апорных пунктах акупантаў у тыле 3-й нямецкай танкавай арміі. У верасні 1943 г. брыгады Ф.Ф. Дуброўскага і В.С. Лявонава вызвалілі Лукомль, а ў пачатку кастрычніка 1943 г. Смаленскі полк І.Ф. Садчыкава ліквідаваў нямецкі гарнізон у Чарэі. У выніку ліквідацыі гарнізонаў быў адкрыты шлях да аб'яднання Полацка-Лепельскай і Сянно-Аршанскай зон, а таксама нямецкаму камандаванню перакрывалася магчымасць па выкарыстанні дарогі Чашнікі – Чарэя – Бор для перамяшчэння сваіх войск. Усяго за 1943 г. на тэрыторыі Аршанскага, Сенненскага, Чашніцкага і Талочынскага раёнаў Смаленскі полк І.Ф. Садчыкава ўдзельнічаў у разгроме 12 варожых гарнізонаў [3, с. 346; 6, с. 328–329].

У пачатку трэцяй дэкады кастрычніка 1943 г. па загадзе начальніка ЦШПР была праведзена Лепельская аперацыя (напад на гарнізоны ў Лепелі і Чашніках, а таксама на 10 іншых нямецкіх апорных пунктаў). Для гэтага ва ўдарную групу было прыцягнута 9 віцебскіх брыгад і Смаленскі полк І.Ф. Садчыкава. Агульнае кіраванне гэтымі сіламі было ўскладзена на камандзіра Чашніцкай брыгады генерал-маёра Ф.Ф. Дуброўскага. Ударную групу прыкрывалі яшчэ 11 партызанскіх фарміраванняў, у тым ліку 1-я і 16-я Смаленскія брыгады. Партызанскі полк І.Ф. Садчыкава пры падтрымцы брыгад Л.І. Сяліцкага і П.І. Кірылава 20–22 кастрычніка 1943 г. штурмаваў гарнізон Чашнікі, які налічваў да 500 немцаў і «народнікаў» і быў добра ўмацаваны ў інжынерным плане. Падчас баёў за Чашнікі партызаны забілі і паранілі 394 салдат і афіцэраў, падбілі пяць танкаў, разбілі 13 дзотаў. У выніку Лепельскай аперацыі было разгромлена дзевяць апорных пунктаў і моцна падарвана баяздольнасць акупацыйных гарнізонаў Лепеля, Чашнікаў і Бачэйкава, для ўтрымання якіх гітлераўцы былі вымушаны зняць воінскія часці з фронту. Пры гэтым галоўную задачу аперацыі – вызваліць ад ворага Лепель і Чашнікі – выканаць не ўдалося [6, с. 328–330; 8, с. 16–21].

У сувязі з тым, што з канца 1943 г. полк І.Ф. Садчыкава і 16-я Смаленская брыгада выконвалі задачы па абароне Полацка-Лепельскай зоны, аб'ектамі іх удараў станавіліся навакольныя гарнізоны праціўніка. Амаль ва ўсіх такіх аперацыях удзельнічала 16-я Смаленская брыгада, якая знаходзілася ў рэзерве аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і ЦШПР і перакідвалася на найбольш адказныя ўчасткі абароны зоны. Так, 14 снежня 1943 г. брыгады «Аляксея» і 1-я Антыфашысцкая сумесна з 16-й Смаленскай нанеслі ўдары па некалькіх апорных пунктах у раёне дарогі Пышна – Беразіно і спынілі скразны рух праціўніка па шашы Лепель – Докшыцы. 16 студзеня 1944 г. адзін з батальёнаў палка І.Ф. Садчыкава, 16-я Смаленская і беларускія брыгады М.П. Раманава, В.В. Мельнікава, М.А. Сакмаркіна выбілі карнікаў з населеных пунктаў у раёне Туроспаль – Баброва – Бярозава – Цётча. У ноч з 18 на 19 студзеня 1944 г. пры ўдзеле смаленскіх партызан былі вызвалены вёскі Краснае і Красная Горка ад падраздзяленняў нямецкай 87-й грэнадзёрскай дывізіі, якая ў баях з партызанамі страціла да 15% свайго асабовага складу і была адпраўлена на фронт. 10 сакавіка 1944 г. полк І.Ф. Садчыкава і 16-я Смаленская брыгада разам з брыгадамі імя В.І. Чапаева і М.А. Сакмаркіна вызвалілі ад немцаў населеныя пункты Першае Гарадзішча і Туроўля і тым самым не дазволілі ворагу замацавацца на левым беразе Заходняй Дзвіны. Усяго да канца сакавіка 1944 г. партызанам зоны ўдалося разграміць 37 апорных пунктаў акупантаў [3, с. 110; 9, с. 316; 10, с. 59, 70–71, 78, 123, 267, 270; 33, с. 31–32].

Паводле зробленых падлікаў, у маі – чэрвені 1944 г. беларускія і смаленскія партызаны сумесна разграмілі 16 гарнізонаў пры прарыве блакіраваных карнікамі тэрыторый. Так, 3 мая 1944 г. пры выхадзе з акружанай немцамі Полацка-Лепельскай партызанскай зоны брыгада А.Ф. Данукалава і два атрады 16-й Смаленскай брыгады штурмам авалодалі апорнымі пунктамі ворага ў вёсках Баяры, Бондары, Лапейкі, Піскунова, Каменка, Слабада. 5 мая 1944 г. пры выхадзе з зоны ўдарная група партызан у складзе брыгады імя УЛКСМ, імя С.М. Караткіна, атрадаў з 16-й Смаленскай брыгады і палка І.Ф. Садчыкава выбіла немцаў з населеных пунктаў Паперына,

Зуі, Новае Сяло і забяспечыла выхад з акружэння асноўных партызанскіх сіл і разам з імі мясцовага насельніцтва [3, с. 140; 5, с. 501–504; 25, л. 402; 10, с. 267, 272, 287].

Гісторыя смаленскіх партызанскіх фарміраванняў на Віцебшчыне ўключае ў сябе барацьбу разам з беларускімі партызанамі супраць карных аперацый праціўніка. Найбольш гераічнай была амаль пяцімесячная абарона Полацка-Лепельскай зоны, функцыянаванне якой займала важнае месца ў планах савецкага камандавання. Сюды былі накіраваны самыя моцныя ўдары акупантаў. Са снежня 1943 г. у абароне зоны ўдзельнічалі 16 партызанскіх фарміраванняў, у тым ліку два смаленскія – 16-я брыгада і полк І.Ф. Садчыкава. Партызанскім злучэннем колькасцю да 17 тысяч чалавек кіравала аператыўная група ЦК КП(б)Б і ЦШПР на чале з У.Е. Лабанком. За снежань 1943 – сакавік 1944 г. партызаны адбілі сем карных акцый. У баях супраць гітлераўцаў асабліва вызначылася 16-я Смаленская брыгада, якая знаходзілася ў рэзерве аператыўнай групы і накіроўвалася ў раёны найбольш цяжкіх баёў для аказання дапамогі беларускім партызанам. На працягу другой паловы красавіка 1944 г. групоўцы праціўніка цаной вялікіх страт удалося паглыбіцца ў зону і сціснуць лінію кругавой абароны партызан з 230 да 20 кіламетраў. У такой сітуацыі 1 мая 1944 г. партызанскія фарміраванні па загадзе Цэнтра зняліся з абароны для выхаду з акружэння. Рашаючую ролю ў штурме нямецкіх пазіцый разам з беларускімі брыгадамі «Аляксея», імя С.М. Кароткіна, імя УЛКСМ, 1-й Антыфашысцкай адыгралі смаленскія фарміраванні – 16-я Смаленская брыгада і полк І.Ф. Садчыкава [1, с. 120; 3, с. 141; 6, с. 333–341; 10, с. 71, 78–81, 123–124, 160–171, 248–252].

Разам з актыўнай баявой дзейнасцю супраць акупантаў на тэрыторыі Віцебшчыны 1-я і 16-я брыгады, полк І.Ф. Садчыкава ў месцах сваёй дыслакацыі праводзілі работу па далучэнні да партызанскай барацьбы мясцовага насельніцтва. Па прыбыцці на беларускую зямлю ў сакавіку1943 г. 16-я Смаленская брыгада мела ў сваім складзе чатыры атрады агульнай колькасцю 180 партызан, а ў снежні 1943 г. налічвала восем атрадаў, якія ўключалі да 720 байцоў. У сваю чаргу, полк І.Ф. Садчыкава з ліпеня па кастрычнік 1943 г. колькасна павялічыўся з 778 да 1270 чалавек, што дазволіла сфарміраваць 4-ы батальён у складзе трох атрадаў, а ў 2-м батальёне быў створаны 10-ы атрад. У складзе 1-й Смаленскай брыгады пасля прыбыцця ў Беларусь у жніўні 1943 г. быў створаны адзін атрад. У выніку цяжкіх баёў па абароне Полацка-Лепельскай зоны (снежань 1943 – пачатак мая 1944 г.) колькасць 16-й Смаленскай брыгады скарацілася да 536 байцоў, а палка І.Ф. Садчыкава – да 844 партызан. Дзякуючы актыўнай арганізацыйнай працы камандавання асабовы склад брыгады і палка за май–чэрвень 1944 г. павялічыўся за кошт мясцовага насельніцтва да 101 і адпаведна 98 партызан. Падчас свайго нядоўгага базіравання на ўсходзе Віцебшчыны вясной – летам 1943 г. таксама папаўнялі свае шэрагі коштам беларускіх патрыётаў 14-я і 17-я Смаленскія брыгады. Агітацыйная і арганізацыйная работы з мясцовым насельніцтвам смаленскіх партызан, з аднаго боку, садзейнічала ўмацаванню іх структур, што дазваляла паспяхова выконваць пастаўленыя баявыя задачы, а з другога, мацавала сувязі з жыхарамі населеных пунктаў і пашырала партызанскі рух на тэрыторыі Віцебшчыны [27, л. 14, 18, 43; 28, л. 1–3, 48, 73; 32, с. 198–200, 317, 320–321, 326–328, 343–344, 348].

Смаленскія партызанскія фарміраванні больш чым за два гады арганізацыйнай і баявой дзейнасці на тэрыторыі Віцебшчыны ўнеслі прыкметны ўклад у разгортванне ўзброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў. Сумесна з беларускімі партызанамі ў рэгіёне была праведзена вялікая колькасць аперацый па ліквідацыі асабовага складу захопнікаў і разгроме важных тылавых аб'ектаў немцаў: чыгуначных і шашэйных камунікацый, чыгуначных станцый, гарнізонаў, штабоў, упраў. Тым самым наносіўся заўважны ўрон баяздольнасці часцей вермахта, найперш яго 3-й танкавай арміі, і аказвалася дзейная дапамога войскам Чырвонай Арміі, якія вялі баі з гітлераўскімі захопнікамі на віцебскім напрамку.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с.
2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева и др.; редкол.: А.Т. Кузьмин и др. – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 1 / редкол.: И.М. Игнатенко и др. – 1983. –591 с.
3. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. / Л. Аржаева и др.; редкол.: А.Т. Кузьмин и др. – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 3 / редкол.: А.Н. Мацко и др. – 1985. – 531 с.
4. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы: в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН БССР. – Минск: Беларусь 1967–1982. – Т. 2.: Развитие всенародного партизанского движения в Белоруссии на втором этапе войны. – Кн. 2. (июль – декабрь 1943) / Г.Н. Шевела и др. – 1978. – 814 с.
5. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы: в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН БССР]. – Минск: Беларусь, 1967–1982. – Т. 3: Всенародное партизанское движения в Белоруссии на завершающем этапе (янв. – июль 1944) / сост. З.И. Белуга и др. – 1982. – 792 с.
6. Жилянин Я.А., Позняков И.Б., Лузгин В.И. Без линии фронта – 2-изд., испр. и доп. – Минск: Беларусь, 1979. – 382 с.
7. Лебедев П.Л. Мы – алексеевцы: записки партизанского разведчика. – 3-е изд., доп. и перераб. – Минск: Беларусь, 1985. – 415 с.
8. Літвін А. Лепельская аперацыя 1943 года // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 2. – С. 12–21.
9. Лобанок В.Е. В боях за Родину. – 3-е доп. изд. – Минск: Беларусь, 1964. – 411 с.
10. Лобанок В.Е. Партизаны принимают бой / лит. запись М.В. Тараткевича. – Минск : Беларусь, 1976. – 320 с.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далее НАРБ). – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 74. Л. 8.
12. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 154.
13. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 158.

14. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 175.
15. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 176.
16. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 263.
17. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 306.
18. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 484.
19. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 523.
20. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 638.
21. НАРБ. – Ф. 1391. Воп. 1. Спр. 139.
22. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 136.
23. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 179.
24. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 16.
25. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 24.
26. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 50.
27. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 62.
28. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 63.
29. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 79.
30. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 179.
31. Партизанская борьба с немецко-фашистскими оккупантами на территории Смоленщины, 1941–1943: документы и материалы. – Смоленск : Кн. изд., 1962. – 520 с.
32. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личным составе / А.Л. Манаенков и др. – Минск: Беларусь, 1983. – 765 с.
33. Филимонов А.А., Титов А.Д., Эполетов Н.И. В едином боевом строю: о совместных действиях русских, белорусских, украинских, литовских, латышских, молдавских партизан // Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т ист. Беларуси; ред. А.М. Литвин. – Минск, 2005. – 126 с.

*Паступіў 26.09.2022*

## СМОЛЕНСКИЕ ПАРТИЗАНСКИЕ ФОРМИРОВАНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ ВИТЕБЩИНЫ (1942–1944 гг.): ОРГАНИЗАЦИОННЫЙ И БОЕВОЙ АСПЕКТ

***А.А. КРИВОРОТ***
***(Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье освещается организация и боевая деятельность на террироти Витебщины смоленских партизан, направленных в регион для развёртывания вооруженной борьбы против гитлеровских аккупантов в 1942–1944 гг., приведены примеры совместных действий витебских и смоленских партизан по созданию отрядов и бригад и участие в этом Витебского обкома КП(б)Б и командования 4-й ударной армии Калининского фронта. Показано, что в 1942 г. основным местом взаимодействия партизан были тыловые объекты противника на белорусской территории в треугольнике дорог Витебск – Орша – Смоленск. Отмечено, что новый этап в боевой деятельности смоленских партизан на Витебщине связан с передислокацией на разные периоды со Смоленской области нескольких бригад (полков). Упомянуты наиболее значимые боевые операции, проведенные совместно витебскими и смоленскими партизанами в разных регионах Витебской области. В выводах констатируется, что смоленские партизанские формирования внесли заметный вклад в разворачивание партизанского движения на Витебщине в годы Великой Отечественной Войны.*

***Ключевые слова:*** *отряд, блокада, бригада, воинский эшелон, гарнизон, группа, диверсия, коммуникации, карательная операция.*

## SMOLENSK PARTISAN FORMATIONS ON THE TERRITORY OF VITEBSK REGION (1942 – 1944): ORGANIZATIONAL AND COMBAT ASPECT

***A. KRYVAROT***
***(The Institute of History of the Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article highlights the organizational and combat activities on the territory of the Vitebsk region of Smolensk partisans sent to the region to deploy an armed struggle against the German occupiers in 1942-1944. Examples of joint actions of Vitebsk and Smolensk partisans to create detachments and brigades and the participation in this of the Vitebsk regional committee of the KP(b)b and the command of the 4th shock army of the Kalinin front are given. It is shown that in 1942 the main place of partisan interaction was the enemy's rear facilities on the Belarusian territory in the triangle of the Vitebsk – Orsha–Smolensk roads. The most significant combat operations carried out jointly by Vitebsk and Smolensk partisans in various regions of the Vitebsk region are mentioned. The conclusions state that the Smolensk partisan formations made a significant contribution to the deployment of the partisan movement in the Vitebsk region during the Great Patriotic War.*

***Keywords:*** *detachment, blockade, brigade, troop train, garrison, group, sabotage, kommunikatsii, punitive operation.*